Бондараў В.

# ПОДЗВІГ АНТОНАВА

**Герой Савецкага Саюза Міхаіл Маісеевіч Антонаў навечна застаўся 20-гадовым. Такім старшы лейтэнант 4 жніўня 1943 года пайшоў у свой апошні бой на чале танкавай роты, і да сваіх баявых таварышаў не вярнуўся. Але яны самі прыходзяць да Антонава: ён пахаваны ў горадзе Арле, яго імем названа там адна з вуліц.**

Бацькі Міхаіла Антонава жылі і працавалі на Касцюкоўшчыне. Потым сям'я пераехала ў г. п. Краснаполле. З дзяцінства Міша марыў паступіць у ваеннае вучылішча. Яго маці Аксіння Іванаўнаўспамінала:

– Вучоба давалася Мішу лёгка і ён цвёрда вырашыў ісці ў ваеннае вучылішча. Закончыў школу і падаў дакументы ва Ульянаўскае танкавае. Быў прыняты, вельмі радаваўся, што стане камандзірам-танкістам. У сценах вучылішча ён сустрэў вестку аб нападзе на нашу краіну фашыстаў. Як ён ні рваўся на фронт, але прыйшлося давучвацца. Міша думаў, што адразу яго пашлюць на фронт, камандаванне вучылішча вырашыла па-іншаму. Выпускніку прапанавалі застацца ў вучылішчы інструктарам.

У кабінеце начальніка вучылішча, куды быў запрошаны лейтэнант Антонаў, было многа камандзіраў. Генерал сказаў:

– У вучылішчы ёсць вакантная пасада інструктара. Мы вырашылі прапанаваць яе вам. Але не спяшайцеся з адказам, падумайце, – сказаў ён Антонаву, пабачыўшы, што лейтэнант гатовы адмовіцца.

Але Антонаў думаць не стаў. Устаў і сказаў:

– Дзякуй за давер'е. Але я павінен быць на фронце. На акупіраванай тэрыторыі Беларусі засталіся мае бацькі. Я не ведаю, што з імі, ці жывыя яны.

Камандаванне вучылішча пайшло насустрач жаданню свайго лепшага выпускніка: праз некалькі дзён лейтэнанта Антонава ўвозіў эшалон з Ульянаўска. Ён трапіў у 85-ю танкавую брыгаду, на Сталінградскі фронт. У баявой біяграфіі Міхаіла Антонава важную ролю адыгралі тыя абставіны, што яму не давялося адчуць горыч адступлення, а пачаць біць фашыстаў у самы разгар Сталінградскай бітвы.

Ад Сталінграда шлях лейтэнанта пралёг да Арла. Тут суджана было танкісту здзейсніць подзвіг, вызначыцца ў баях за вызваленне горада.

20 ліпеня 1943 года старшы лейтэнант Антонаў прыняў танкавую роту.Умінуты зацішша таварышы цёпла павіншавалі яго з чарговым воінскім званнем. А праз два дні танкавы полк быў узняты па трывозе і ўведзен у прарыў каля вёскі Вяжы Навасільскага раёна.

Архіўныя дакументы палка захоўваюць нямала запісаў аб самаадданых дзеяннях старшага лейтэнанта Антонава. Чатыры разы Антонаў хадзіў у атаку, сам падбіў дзве самаходныя гарматы ворага, яшчэ адну раздавіў гусеніцамі танка. Праз некалькі гадзін, калі рота зноў пайшла наперад, старшы лейтэнант Антонаў каля вёскі Казанка ўступіў у адзінаборства з цяжкім танкам "Тыгр" і трапным агнём падбіў яго.

На подступах да Арла ў раёне лесапільнага завода падавіў чатыры гарматы,змяў тры колавыя машыны і знішчыў два ўзвода пяхоты. На ўсходняй акраіне Арла танк Антонава першым уступіў у бой. Прайшоўшы праз акопы гітлераўцаў, ён запаліў тры аўтамашыны праціўніка і рушыў з ротай у глыбіню абароны ворага. Але тут па нашых танках адкрыла агонь добра замаскіраваная і да той мінуты маўчаўшая гармата фашыстаў. Тры снарады трапілі ў танк Антонава. Агонь ахапіў баявую машыну. Экіпаж на чале са старшым лейтэнантам згарэў у танку...

У вызваленым Арле танкісты палка, адшукаўшы згарэўшы танк Антонава, з усімі воінскімі ўшанаваннямі пахавалі героя. Падпалкоўнік Кавалёў у той дзень прадставіў старшага лейтэнанта Міхаіла Антонава да звання Героя Савецкага Саюза...

Памяць аб героі жыве. Ганарацца жыхары Арла, што сын Беларусі праявіў мужнасць у баях за вызваленне іх роднага горада. Імя Героя носіць і адна з вуліц г. п. Краснаполля.

**Бондараў, В. Подзвіг Антонава / Віктар Бондараў // Голас Касцюкоўшчыны. — 2010. — 8 мая. — С. 2.**